Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар універсітэта
_____ Н.У.Карчэўская
25.06 2026
Рэгістрацыйны № ВД – 626-140эвуч.

# БЕЛАРУСКАЯ ЭТНАМУЗЫКАЛОГІЯ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне
па спецыяльнасцях 6-05-0215-09 Харавая творчасць,
6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў,
прафілізацыях: харавая музыка народная;
сольнае выканальніцтва

2026

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцям: 6-05-0215-09 Харавая творчасць, 6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.10.2023 г. № 270, вучэбнага плана БДУКМ па спецыяльнасцям.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*Л.Л. Ражкова*, загадчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук;
*С.Ф. Войцік,* дацэнт кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*П.У.Юхновіч*, хормайстар ДУ "Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.І.Цітовіча", магістр мастацтвазнаўства;
*Т.С Гажэўская-Пешак,* дацэнт кафедры харавой музыкі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 10 ад 22.05.2026г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў" (пратакол № 5 ад 28.05.2026.)

**САГЛАСАВАНА:**
Дырэктар Палаца культуры Мінскага трактарнага завода
_____Н.У.Кользун

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская этнамузыкалогія» займае значнае месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў спецыяльнасцяў «Мастацтва народных спеваў» і «Харавая творчасць». У сучасных умовах узрастання ролі нацыянальнай культуры і захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны вывучэнне традыцыйнай песеннай культуры беларусаў набывае асаблівую актуальнасць. Вучэбная дысцыпліна накіравана на фарміраванне ў студэнтаў цэласнага ўяўлення пра генезіс, жанрава-стылявыя асаблівасці і рэгіянальную разнастайнасць беларускага песеннага фальклору, што з'яўляецца асновай прафесійнай дзейнасці спецыялістаў у сферы культуры, мастацтва і адукацыі. Увасабленне традыцыйных норм выканання ўзораў народнай песні на сучасным этапе непарыўна звязана з вывучэннем яе рэгіянальных асаблівасцяў. Вывучэнне стылявых асаблівасцяў пеўчых стыляў беларускага Паазер'я, Палесся, Падняпроўя, Панямоння, Цэнтральнага рэгіёна Беларусі стала магчымым толькі на падставе назапашанага нотнага матэрыялу, фоназапісаў ад носьбітаў народна-песенных традыцый, даследаванняў вядомых фалькларыстаў. Вучэбная дысцыпліна «Беларуская этнамузыкалогія» лагічна працягвае і развівае змест вучэбнай дысцыпліны «Беларуская народная песенная творчасць і спеўная этнафонія», узаемадзейнічае з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як, «Харавы клас», «Сольныя спевы», «Беларускі побытавы танец», забяспечваючы паглыбленне ведаў у галіне традыцыйнай музычнай культуры, а таксама пашырэнне практычных уменняў і навыкаў аналізу, інтэрпрэтацыі і выкарыстання фальклорнага матэрыялу ў прафесійнай дзейнасці.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне ў студэнтаў сістэмы тэарэтычных і практычных ведаў аб заканамернасцях існавання і развіцця традыцыйнай песеннай культуры, узброіць студэнтаў асноўнымі метадамі этнамузыказнаўчага аналізу і тыпалагізацыі музычнага фальклору для вырашэння прафесійных задач.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– сфарміраваць уяўленне пра асноўныя этапы станаўлення і развіцця сусветнай і беларускай этнамузыкалогіі, вядучыя школы, напрамкі і постаці айчыннай і замежнай навукі;

– асвоіць асноўныя метады этнамузыказнаўчага даследавання народнай музыкі, у тым ліку структурна-стылявы, функцыянальны, параўнальны і арэальны падыходы;

– раскрыць ўзаемасувязі песеннага фальклору з кантэкстам традыцыйнай культуры, абрадавасцю, паэтычным тэкстам і дыялектнай спецыфікай;

– выпрацаваць у студэнтаў алгарытм аналізу музычнай мовы народнай песні, яе мелодыка-рытмічных, ладавых і фактурных асаблівасцей, вызначаць арэалы іх бытавання;

– развіць здольнасць выкарыстоўваць этнамузыкалагічныя веды і навыкі ў навукова-даследчай, педагагічнай, выканальніцкай і культурна-асветніцкай дзейнасці.

У выніку вывучэння дадзенай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя этапы станаўлення і развіцця сусветнай і беларускай этнамузыкалогіі, вядучыя навуковыя школы, напрамкі і ключавыя постаці айчыннай і замежнай этнамузыказнаўчай навукі;

– вызначальныя прыкметы фальклорнай культуры, прынцыпы і механізмы захавання і аднаўлення спеўнай традыцыі;

– спецыфіку фальклору як "культурнага тэксту", асноўныя віды кантэксту фальклорнай культуры (выканальніцкі, сітуацыйны і культурны) і іх ролю ў фарміраванні і інтэрпрэтацыі песеннага фальклору.

– прынцыпы і алгарытм аналізу музычнай мовы народнай песні, яе мелодыка-рытмічных, ладавых і фактурных асаблівасцей;

– рэгіянальныя песенныя стылі беларускай традыцыйнай музыкі і іх характэрныя мелодыка-рытмічныя, ладавыя і інтанацыйныя прыкметы;

– асноўныя тыпы аднаголасся і шматгалосся ў беларускім музычным фальклоры, іх структурныя і рэгіянальныя асаблівасці;

– спецыфіку традыцыйных выканальніцкіх прыёмаў у фальклорных спевах і прыёмы іх увасаблення ў вакальнай практыцы;

*умець:*

– вызначаць дыялектныя і рэгіянальныя асаблівасці народнай песеннай традыцыі;

– ажыццяўляць комплексны аналіз фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу;

– аналізаваць музычную мову народнай песні (мелодыку, рытм, лад, форму, фактуру) і вызначаць арэалы яе бытавання;

– сістэматызаваць і класіфікаваць узоры народнай песні;

– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай, аўдыё- і відэакрыніцамі па этнамузыкалогіі;

– прымяняць традыцыйныя вакальныя прыёмы і тыпы шматгалосся, характэрныя для розных рэгіёнаў Беларусі, у працы з фальклорным матэрыялам;

– адрозніваць фальклорныя запісы розных рэгіёнаў Беларусі паводле стылявых і выканальніцкіх прыкмет.

*валодаць:*

– прафесійным тэрміналагічным апаратам;

– навыкамі комплекснага этнамузыкалагічнага аналізу музычна-фальклорных тэкстаў;

– прынцыпамі сістэматызацыі, класіфікацыі і тыпалагізацыі народных песенных напеваў;

– прыёмамі вызначэння мелодыка-рытмічных, ладавых і інтанацыйных асаблівасцяў розных жанраў песеннага фальклору;

– навыкамі працы з навуковымі крыніцамі, палявымі аўдыё- і відэаматэрыяламі ў галіне этнамузыкалогіі.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Беларуская этнамузыкалогія» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыялізаванай кампетэнцыі: выкарыстоўваць асноўныя катэгорыі беларускай народна-песеннай творчасці, песеннай дыялекталогіі.

У межах адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен не толькі набыць тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным жыцці краіны.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Беларуская этнамузыкалогія» усяго прадугледжана 180 гадзін, з якіх 70 гадзін – аўдыторныя (34 гадзіны лекцыйні і 36 гадзін семінарскія) заняткі. вучэбнай дысцыпліна вывучаецца ў 3 і 4 сяместрах па раздзелах. Форма бягучай атэстацыі – вуснае апытанне ці тэставыя заданні. Рэкамендаваная форма прамежкавай атэстацыі – залік і экзамен;

Для завочнай скарочанай формы атрымання адукацыі прадугледжана самастойнае вывучэнне наступных тэм:

Раздзел І. Тэорыя фальклору і гістарыяграфія этнамузы-калагічных даследаванняў.

– *Тэма 1.* Метады вывучэння народнай музыкі;

– *Тэма 2.* Музычная мова і іншыя "мовы" традыцыйнай культуры;

Раздзел II. Рэгіянальная ты-палогія беларускай народнай песні: натацыя, фактура, шматгалоссе.

– *Тэма 1.* Асновы натацыі народных песен;

– *Тэма 2.* Фактура беларускай народнай песні.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел І. Тэорыя фальклору і гістарыяграфія этнамузыкалагічных даследаванняў

### *Уводзіны*

Паняцце "этнамузыкалогія", гісторыя ўзнікнення тэрміна "этнамузыкалогія". Прадмет і задачы вучэбнай дысцыпліны «Беларуская этнамузыкалогія». Музычны фальклор (этнічная музыка вуснай традыцыі) як частка нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Неабходнасць яго вывучэння і захавання.

### *Тэма 1. Метады вывучэння народнай музыкі*

Метад структурнага і стылявога аналізу народнай музыкі. Параўнальны метад даследавання народнай музыкі. Функцыянальны метад і яго выкарыстанне ў этнамузыкалогіі. Арэальны метад вывучэння традыцыі вуснай музычнай культуры. Метады сістэматызацыі і класіфікацыі музычнага фальклору. Удасканаленне факталагічнай базы навукі, эксперыментальныя метады ў этнамузыкалогіі. Адукацыйны, выхаваўчы і сацыякультурны аспекты этнамузыкалогіі.

### *Тэма 2. Музычная мова і іншыя "мовы" традыцыйнай культуры.*

Неабходнасць і спецыфіка перадачы ведаў ва ўмовах культуры вуснага тыпу. Сімвалічныя "мовы" народнай культуры, якія адрозніваюцца паміж сабой сродкамі перадачы інфармацыі, але маюць адзінае "поле" значэнняў. Рытуал і яго коды. Гукавы код народнай культуры. Функцыі гуку і голасу ў традыцыйнай культуры.

### *Тэма 3. Фальклор як сістэма традыцыйнай культуры: паняцце, тэорыя, эвалюцыя*

Паняцце «фальклор» і гісторыя фарміравання тэрміна. Шырокае і вузкае разуменне фальклору ў айчыннай і замежнай фалькларыстыцы. Фальклор як аб'ект навуковага даследавання і як частка традыцыйнай культуры. Фальклор як цэласная сістэма: узаемадзеянне слова, гуку, руху і дзеяння ў фальклорным акце. Паняцце фальклорнага акту, яго сацыяльныя і культурныя функцыі. Паліфункцыянальнасць фальклору. Асноўныя прыкметы фальклору: унутрысітуатыўнасць, сінкрэтызм, традыцыйнасць, вусная форма бытавання, варыянтнасць, ананімнасць. Фальклор як працэс калектыўнай творчасці.

### *Тэма 4. Традыцыя, тыпалогія і сучаснае бытаванне фальклору*

Паняцце традыцыі ў фальклорнай культуры. Механізмы пераемнасці, суадносіны статыкі і дынамікі. Фальклор як форма вуснай гістарычнай памяці этнасу. Стадыі развіцця фальклору і яго месца ў сістэме духоўнай культуры: архаічная (сінкрэтычная), дуалістычная і ўрбаністычная стадыі. Узаемадзеянне фальклорных і нефальклорных форм культуры. Класіфікацыі фальклору (мастацтвазнаўчая, філалагічная, экспертная). Асноўныя віды і жанры фальклору. Традыцыйны і сучасны фальклор. Аўтэнтычны фальклор і фальклярызм як форма сцэнічнай інтэрпрэтацыі народнай культуры.

### *Тэма 5. Прынцыпы і механізмы функцыянавання фальклору*

Асноўныя заканамернасці бытавання фальклору ў традыцыйнай культуры. Прынцыпы захавання і адраджэння фальклорнай культуры. Прынцып абмежавання знешніх уздзеянняў як умова захавання фальклорнай сістэмы. Прынцып множнасці праяў фальклорнай творчасці. Прынцып натуральнай спецыялізацыі ў фальклоры. Тыпы музычнай і фальклорнай творчасці ў кантэксце традыцыйнай культуры.

### *Тэма 6. Тэкст і кантэкст у фальклоры*

Паняцце тэксту ў гуманітарных навуках і яго міждысцыплінарнае разуменне. Тэкст як структурна-сэнсавае адзінства зместу, формы і сродкаў выражэння. Асаблівасці фальклорнага тэксту ў параўнанні з тэкстам прафесійнага мастацтва. Тэкст як носьбіт сацыяльна і культурна значнай інфармацыі.

Спецыфіка бытавання вуснага і пісьмовага тэксту. Устны тэкст як сінкрэтычнае ўтварэнне: суадносіны слова, гуку, інтанацыі, жэсту, мімікі і руху. Праблемы фіксацыі фальклорнага тэксту і страты сэнсаў пры перакладзе з вуснай формы ў пісьмовую. Варыянтнасць і непаўторнасць фальклорнага тэксту ў кожным акце выканання.

Паняцце кантэксту і яго значэнне ў інтэрпрэтацыі фальклорных з'яў. Асноўныя віды кантэксту: выканаўчы, сітуацыйны і культурны. Кантэкст культуры і кантэкст сітуацыі (паводле Б. Маліноўскага) як неабходная ўмова разумення фальклорнага паведамлення. Іерархічная мадэль кантэксту ў фальклорным мастацтве.

Узаемасувязь песеннага тэксту і кантэксту яго бытавання. Манакантэкстнасць абрадавых песень і поліконтэкстнасць пазаабрадавых лірычных жанраў. Функцыя кантэксту як фактара, які вызначае сэнс, форму і спосаб выканання фальклорнага тэксту.

Фальклорны тэкст як форма калектыўнай камунікацыі. Асаблівасці камунікатыўных функцый фальклору: інфарматыўнай, выразнай (эмацыйнай), уздзеяння і паэтычнай. Надіндывідуальны характар фальклорнай творчасці, калектыўныя ўстаноўкі і роля традыцыі ў кантролі тэксту.

Значэнне культурнага кантэксту для сучаснага асэнсавання фальклорных тэкстаў. Праблемы інтэрпрэтацыі і аднаўлення страчаных сэнсаў. Фальклорны тэкст як ключ да разумення традыцыйнага светапогляду і міфалагічнага мыслення.

### *Тэма 7. Сімвалізм у фальклоры*

Паняцце сімвалізму ў традыцыйнай культуры і яго сувязь з развіццём мовы і народнага мыслення. Сімвал як форма абагульнення і перадачы культурных сэнсаў. Асноўныя тыпы сімвалічных сувязяў: параўнанне, супрацьпастаўленне і прычынна-выніковыя адносіны.

Сувязь сімвалізму з архаічнымі ўяўленнямі пра свет. Роля агню і святла як універсальных асноваў вобразнасці ў народнай паэзіі. Сімвалічнае асэнсаванне чалавечых эмоцый (каханне, жаданне, радасць, смутак) праз вобразы прыродных стыхій.

Сімволіка прыродных элементаў у фальклоры: агонь, вада, вецер, зямля, расліны, колеры. Іх значэнні як знакаў жыццёвых станаў, эмоцый і сацыяльных адносін. Сувязь сімвалічных вобразаў з міфалагічнымі ўяўленнямі і абрадавымі практыкамі.

Сімволіка чалавечых адносін і сацыяльных працэсаў: каханне, шлюб, разлука, лёс. Вобразы ніткі, дарогі, вады, вузла, ключа як знакаў сувязі, залежнасці, выбару і жыццёвага шляху.

Сістэмны характар сімволікі ў фальклоры. Узаемасувязь сімвалаў, іх палісемантычнасць і залежнасць ад кантэксту. Значэнне сімвалізму для інтэрпрэтацыі фальклорных тэкстаў і разумення традыцыйнага светапогляду.

## Раздзел II. Рэгіянальная тыпалогія беларускай народнай песні: натацыя, фактура, шматгалоссе

### *Тэма 1. Асновы натацыі народных песен*

Спецыфіка фальклорных выканальніцкіх прыёмаў і спосабы іх абазначэння. Асваенне знакавай семантыкі. Пад'езды і спады. Глісанда. Гукі невызначанай вышыні. Завышэнні і прыніжэнні тону. Фермата без кропкі і перавернутая фермата. Рэальная працягласць ферматы з кропкай, якая абазначаецца цэлай лічбай або дробам.

### *Тэма 2. Фактура беларускай народнай песні*

Тыпы фактуры: манадыйная, поліфанычная, гамафонна-гарманічная.

Шматгалоссе ў беларускім песенным фальклоры. Гетэрафонія і яе разнавіднасці: нязначнае адхіленне ад унісону, полірытмічная манодыя, дыяфонія на бурдоннай аснове, спеў "з пералівамі". Паліфонія: спеў "з падводкай" (верхні сольны голас кантрапунктуе хору ніжніх галасоў). Гамафонна-гарманічны склад. Шматгалоссе тыпу "ўторы". Шматгалоссе кантавага тыпу.

### *Тэма 3. Пеўчыя стылі беларускага Паазер'я (Падзвінне)*

Геаграфічныя межы: унутраны падзел на заходні, цэнтральны, усходні, паўночны рэгіёны. Гістарычныя і этнаграфічныя асаблівасці.

Чатыры сезонна-календарныя цыклы: зімовы, веснавы, летні, восеньскі.

Два віды вясельнага абраду: вясельны абрад паўночна-ўсходняй зоны Падзвіння (паводле стаўбавога рытуалу) і абрад цэнтральна-заходняй зоны (паводле каравайнага рытуалу).

Пазаабрадавыя песні: бяседныя, балады, лірычныя, жартоўныя.

Стылявыя асаблівасці песеннай культуры Падзвіння: манадыйнасць, ансамблевыя спевы ва ўнісон (з рэдкімі эпізадычнымі адхіленнямі), антыфонная манера выканання, характэрная для каляндарных і вясельных песень.

### *Тэма 4. Пеўчыя стылі Заходняга Палесся (Брэсцкага)*

Геаграфічныя межы і этнаграфічныя асаблівасці. Песенная культура Піншчыны, раёнаў Століна, Давыд-Гарадка, Лунінца, Драгічына, Іванава, Маларыты і інш.

Разгорнутасць сезонна-каляндарных цыклаў: зімовага, веснавога, летняга, восеньскага.

Вясельная песенная абрадавасць паводле каравайнага рытуалу.

Пазаабрадавыя песні з умоўнай прымеркаванасцю да часу і абставін выканання.

Стылявыя асаблівасці. Шматгалоссе песеннай культуры Заходняга Палесся: унісонна-гетерафанічная традыцыя, прадстаўленая полірытмічнай манодыяй, дыяфоніяй на бурдоннай аснове, спевамі "з пералівамі" і паліфоніяй – спевамі "з падводкай".

### *Тэма 5. Пеўчыя стылі Усходняга Палесся (Гомельскага)*

Геаграфічныя межы. Гістарычныя і этнаграфічныя асаблівасці.

Песенная культура Гомельшчыны: Тураўскі раён, водныя лініі Рэчыца – Лоеў, Петрыкаў – Мазыр, раёны Хойнікаў, Нароўлі, Ельска, Жыткавічаў, Лельчыц. Унікальная песенная культура Веткі.

Палескае шматгалоссе прадстаўлена спевамі "з падводкай". Віды падводкі: падводка прамая, падводка "з закруткамі".

Знакамітыя выканаўцы народнай песні: С.Дубейка, Г.Венгура, Ф.Олесіч, І.Прыбора.

### *Тэма 6. Пеўчыя стылі Падняпроўя*

Геаграфічныя межы. Гістарычныя і этнаграфічныя асаблівасці.

Песні каляндарнага цыклу, песні сямейна-абрадавага цыклу, песні пазаабрадавыя, не прымеркаваныя да пэўнага часу і абставін выканання – уяўляюць змест песенных традыцый Падняпроўя. Найбольш разгорнутымі ў земляробчым календары з'яўляюцца веснавы і летні цыклы. Вядучая роля карагодна-гульнявой традыцыі і яе ўплыў на ўсе песенныя жанры – ад каляндарна-земляробчых да сямейна-абрадавых і пазаабрадавых. Наяўнасць і разнастайнасць бытуючых карагодаў: кола, шэсце, "сценка на сценку", кола ў коле, крывы танец.

Вяселле Падняпроўя і яго ярка выяўленыя (у параўнанні з іншымі рэгіёнамі) гульнёвыя элементы: выкраданні, выкупы, падмены, пераапрананне і іншыя.

У ансамблевым спеве характэрная для ўсходнебеларускай традыцыі разнавіднасць гетэрафоніі, якая вызначаецца як "спеў з пералівамі".

Прыклады шматгалосся гарманічна-кантрапунктычнага складу – спевы "з падтягам", элементы падгалоскавана-паліфанічнага шматгалосся (характэрнага пераважна для Заходняга Палесся), якія патрабуюць шырокага руху мелодыі песні і імправізацыйнага майстэрства "падводкі". На Падняпроўі гэтыя формы гуртавых спеваў лакальна зафіксаваны на поўдні Магілёўшчыны, а таксама ў Быхаўскім і Слаўгарадскім раёнах.

### *Тэма 7. Пеўчыя стылі Панямоння*

Геаграфічныя межы. Гістарычныя і этнаграфічныя асаблівасці.

Спецыфіка песеннай культуры Панямоння: па-першае, песенныя жанры старажытнага гісторыка-стылявога пласта тут захаваліся слаба, па-другое, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Беларусі ў Панямонні дамінуюць познетрадыцыйныя ўзоры песеннай культуры.

Каляндарна-абрадавы веснавы цыкл з разнастайнымі песнямі-загуканнямі, валачобнымі, юраўскімі песнямі. Уплыў польскай мовы на тэксты валачобных і вясельных песень. Яркая з'ява веснавой абраднасці – песенны рытуал "Юр'я".

Песні жніва і іх адрозненне ад жніўных песень Палесся.

Вясельныя песні Панямоння. Рэгіянальныя асаблівасці абраду заходнебеларускага вяселля.

Пазаабрадавыя песні.

Шматгалоссе Панямоння: тып "ўторы", шматгалоссе кантавага тыпу.

### *Тэма 8. Пеўчыя стылі Цэнтральнай Беларусі*

Геаграфічныя межы. Гістарычная і этнаграфічныя асаблівасці.

Спецыфіка песеннай культуры: узаемадзеянне і сустрэчны рух паўночна-заходніх і паўднёва-ўсходніх традыцый.

Песні каляндарна-земляробчага цыклу (зімовыя, веснавыя, летнія, восеньскія).

Вясельна-абрадавая песенная традыцыя рэгіёна.

Пазаабрадавыя песні (любоўныя, балады, сямейна-бытавыя, жартоўныя, сацыяльна-бытавыя, карагодныя, гульнявыя).

Выканальніцкія асаблівасці сумеснага выканання: шматлікія антыфоны, палірытмічная манодыя, спевы "з падцягам", "з пералівамі", "з падводкай".

Унікальныя абрады, якія захаваліся ў Цэнтральнай Беларусі: "Калядныя цары", "Цягнуць Каляду на дуба", "Тройца").

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі

| Нумар раздзелу, тэмы | Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| 1. | **Раздзел I. Тэорыя фальклору і гістарыяграфія этнамузыкалагічных даследаванняў** | | | | |
| 2. | *Уводзіны* | 1 | | | |
| 3. | *Тэма 1.* Метады вывучэння народнай музыкі | 1 | | 1 | Вуснае апытанне |
| 4. | *Тэма 2.* Музычная мова і іншыя "мовы" традыцыйнай культуры | 1 | 2 | 1 | Вуснае апытанне |
| 5. | *Тэма 3.* Фальклор як сістэма традыцыйнай культуры: паняцце, тэорыя, эвалюцыя | 2 | 3 | 2 | Тэст |
| 6. | *Тэма 4.* Традыцыя, тыпалогія і сучаснае бытаванне фальклору | 2 | 3 | 2 | Тэст |
| 7. | *Тэма 5.* Прынцыпы і механіз-мы функцыянавання фальк-лору | 2 | 2 | 1 | Вуснае апытанне |
| 8. | *Тэма 6.* Тэкст і кантэкст у фальклоры | 2 | 2 | 1 | Вуснае апытанне |
| 9. | *Тэма 7.* Сімвалізм у фальклоры | 3 | 2 | | |
| 10. | **Раздзел II. Рэгіянальная тыпалогія беларускай народнай песні: натацыя, фактура, шматгалоссе** | | | | |
| 13. | *Тэма 1.* Асновы натацыі народных песен | 1 | | | |
| 14. | *Тэма 2.* Фактура беларускай народнай песні | 1 | 2 | | |
| 15. | *Тэма 3.* Неўчыя стылі беларускага Паазер'я (Падзвінне) | 2 | 2 | | |
| 16. | *Тэма 4.* Неўчыя стылі Заходняга Палесся (Брэсцкага). | 2 | 2 | | |
| 17. | *Тэма 5.* Неўчыя стылі Усходняга Палесся (Гомельскага) | 2 | 2 | 2 | Вуснае апытанне |
| 18. | *Тэма 6.* Неўчыя стылі Падняп- | 2 | 2 | 2 | Вуснае |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | роўя | | | | апытанне |
| 19. | *Тэма 7.* Пеўчыя стылі Панямоння | 2 | 2 | 2 | Даклад |
| 20. | *Тэма 8.* Пеўчыя стылі Цэнтральнай Беларусі | 2 | 2 | | |
| | **УСЯГО: 70** | **28** | **28** | **14** | |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## для завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі

| Нумар раздзелу, тэмы | Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
| 1. | **Раздзел I. Тэорыя фальклору і гістарыяграфія этнамузыкалагічных даследаванняў** | | |
| 2. | *Уводзіны* | 1 | |
| 3. | *Тэма 1.* Метады вывучэння народнай музыкі | | |
| 4. | *Тэма 2.* Музычная мова і іншыя "мовы" традыцыйнай культуры | | |
| 5. | *Тэма 3.* Фальклор як сістэма традыцыйнай культуры: паняцце, тэорыя, эвалюцыя | 1 | |
| 6. | *Тэма 4.* Традыцыя, тыпалогія і сучаснае бытаванне фальклору | 1 | |
| 7. | *Тэма 5.* Прынцыпы і механізмы функцыянавання фальк-лору | 1 | |
| 8. | *Тэма 6.* Тэкст і кантэкст у фальклоры | | 1 |
| 9. | *Тэма 7.* Сімвалізм у фальклоры | | 1 |
| 10. | **Раздзел II. Рэгіянальная ты-палогія беларускай народнай песні: натацыя, фактура, шматгалоссе** | | |
| 13. | *Тэма 1.* Асновы натацыі народных песен | | |
| 14. | *Тэма 2.* Фактура беларускай народнай песні | | |
| 15. | *Тэма 3.* Пеўчыя стылі беларускага Паазер'я (Падзвінне) | 1 | |
| 16. | *Тэма 4.* Пеўчыя стылі Заходняга Палесся (Брэсцкага). | 1 | |
| 17. | *Тэма 5.* Пеўчыя стылі Усходняга Палесся (Гомельскага) | 1 | |
| 18. | *Тэма 6.* Пеўчыя стылі Падняпроўя | 1 | |
| 19. | *Тэма 7.* Пеўчыя стылі Панямоння. | | 1 |
| 20. | *Тэма 8.* Пеўчыя стылі Цэнтральнай Беларусі | | 1 |
| | **УСЯГО: 12** | **8** | **4** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

Асноўная

1. *Белорусская этномузыкология*: Очерки истории (XIX–XX вв.) / Ред. З. Можейко. – Минск: Тэхналогія, 1997. – 254 с.: нот.

2. *Мухарынская, Л. С.,* Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л. С. Мухарынская, Т. С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.

Дадатковая

1. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т.1. Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка і інш. — Мінск: Бел. навука, 2001. — 797 с.

2. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т.2. Віцебскае Паддзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш.; Складальнік Т. Б. Варфаламеева. — Мінск: Бел. навука, 2004. — 910 с.

3. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т.3. Гродзенскае Панямонне. У 2-х кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; аўт. Ідэі Т, Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. — Мінск: Выш. шк., 2006. — 608 с.

4. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; ідэя і агульнае рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. — Мінск: Выш. шк., 2008. — 559 с. : каляр. іл.

5. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т. 5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; ідэя і агульнае рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. — Мінск: Выш. шк., 2010. — 847 с. : каляр. іл.

6. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн 1 / Т. В. Валодзіна [і інш.]; ідэя і агул. Рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. Шк., 2012. – 910 с.: каляр. іл.

## Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі

– вуснае апытанне па;
– тэставыя заданні
– прадстаўленне прэзентацыі ці рэферата на зададзеную тэму;

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

У працэсе засваення вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны быць мэтанакіраваны на актыўнае засваенне матэрыялаў, прэзентуемых выкладчыкам на лекцыях, а таксама дапаўняць гэтыя матэрыялы самастойным вывучэннем рэкамендаванай літаратуры, праслухоўвання аўдыё запісаў, прагляду відэаматэрыялаў.

Неабходна весці канспекты лекцый, паколькі некаторыя тэмы могуць быць няпоўна ці недастаткова аб'ёмна раскрыты ў існуючых вучэбных дапаможніках. Пры канспектаванні варта запісваць усе падзеі, імёны, факты, названыя выкладчыкам, выразна пазначаючы ступень іх значнасці ў рэчышчы разглядаемай праблемы.

Пры падрыхтоўцы дакладаў і рэфератаў, прапанаваных выкладчыкам, неабходна карыстацца рэкамендаванымі крыніцамі (спісамі асноўнай і дадатковай літаратуры па тэмах). Пры складанні дакладу або рэферата студэнт павінен наперад азнаёміцца з рэкамендаванай літаратурай, скласці структуру-план (які складаецца з ўступнага раздзела, у якім абгрунтоўваецца значнасць і актуальнасць абранай тэмы, асноўнага раздзелу, які раскрывае тэму дакладу, заключнага раздзелу).

Пры вусным выступленні важна сачыць за свабодай прамовы, тэкстам, пазбягаць выкарыстоўвання ўступных слоў, слоў-«паразітаў», бытавізмаў. Пры падрыхтоўцы да заліку або іспыту варта таксама ўлічваць неабходнасць вуснай прэзентацыі матэрыялу, для чаго рэкамендуецца таксама пісьмова складаць план адказу ў выглядзе пунктаў або тэзісаў.